## Каб стаць студэнтам -гісторыкам ПДУ, неабходна:

1. <u>здаць ЦТ па прадметам:</u>
- гісторыя Беларусі;
- гісторыя найноўшага часу;
- беларуская (руская) мова;
2. <u>падаць у прыёмную камісію:</u>
- заяву на імя рэктара;
- арыгіналы сертыфікатаў ЦТ;
- арыгінал дакумента аб адукацыі і дадаткаў да яго;
- медыцынскую даведку;
- 6 фотаздымкаў 3х4 см;
- + дакументы, што пацвярджаюць правы на ільготы (пры наяўнасці).

Падрабязная інфармацыя – тут: psu.by/index.php/priyomnaja-komissija/5300.html



**Інтэр'ер вучэбнага корпуса студэнтаў-гісторыкаў.**

### ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ


Прыёмная камісія: г. Наваполацк
вул. Блахіна, 29, (каб. 348)
адказны сакратар:
Шчэрбік Дзмітрый Васільевіч

Тэлефоны: + 375 214 53-21-61
+ 375 214 51-13-93
+375 29 719-93-15
E-mail: priem@psu.by
Сайт універсітэта: psu.by


### КАФЕДРА АЙЧЫННАЙ І ЎСЕАГУЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ


г. Полацк
вул. Стралецкая, 4 (аўдыторыя 101)
Загадчык кафедры: канд. гіст. навук
Шыдлоўскі Сяргей Алегавіч

Тэлефон: + 375 214 42-87-07
E-mail: kaf.ist.psu@gmail.com


# Спецыяльнасць «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)» 1-21 03 01-01.

***Абітурыенту-2014***

**ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**Гістарычна-філалагічны факультэт**

**Кафедра айчыннай і ўсеагульнай гісторыі**



**Вучэбны корпус студэнтаў-гісторыкаў ПДУ — будынак езуіцкага калегіума-акадэміі-кадэцкага корпуса. Помнік архітэктуры XVIII — XIX стст.**

## Кваліфікацыя: «Гісторык. Выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін».

# Вучыцца «на гісторыка» трэба ў Полацку!

## Спецыяльнасць «Гісторыя»

Дзе ж атрымліваць гістарычную адукацыю, як не ў самым старажытным горадзе Беларусі?

Першы набор на спецыяльнасць «Гісторыя» ў Полацкім універсітэце адбыўся ў 1994 г. Выпускнікі ПДУ з дыпломам гісторыка працуюць у школах і ўніверсітэтах, музеях і архівах, арганізацыях, на прадпрыемствах розных формаў уласнасці, у органах дзяржаўнага кіравання і ўнутраных спраў. Некаторыя з іх абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

## Формы навучання:

- дзённая (4 гады);
- завочная (дыстанцыйная) (5 гадоў).



**Фальклорны гурт «Варга́н» і яго кіраўнік кандыдат біялагічных навук В.А. Емяльянчык.**



**Этнаграфічная экспедыцыя на чале з дацэнтам, кандыдатам гіст. навук У.А. Лобачам, Докшыцкі раён.**

## Нашы выпускнікі падрыхтаваны да:

- выкладчыцкай дзейнасці;
- даследчыцкай і навукова-педагагічнай работы;
- працы ў музеях, архівах, установах культуры;
- работы на прадпрыемствах, у рэспубліканскіх і мясцовых органах кіравання.



**Выпускнік ПДУ, прафесар, доктар гіст. навук Д.У. Дук праводзіць экскурсію.**

## Перавагі атрымання гістарычнай адукацыі ў Полацкім універсітэце:

1. індывідуальны падыход да кожнага студэнта;
2. кваліфікаваныя выкладчыкі — гісторыкі, этнолагі, археолагі, антраполагі;
3. усе іншагароднія першакурснікі засяляюцца ў інтэрнат;
4. памяркоўны кошт платнай формы навучання;
5. вучоба ў будынках калегіума-акадэміі XVIII — XIX стст.;
6. навучанне і ўдзел у археалагічных раскопках у Полацку — горадзе з багатай гісторыяй;
7. этнаграфічныя экспедыцыі і археалагічныя раскопкі ў маляўнічых кутках Беларускага Падзвіння;
8. магчымасць працягнуць адукацыю ў магістратуры пры кафедры.



**Археалагічныя раскопкі, Глыбоцкі раён.**